**Summary**

In article it will be a question of Cold war - the 46-year-old period of world history which was characterised by constant opposition of the contradictory parties - super-states of the USA and the USSR in all spheres of a political and public life. But in more details we will stop on military aspect - workings out of the nuclear weapon as it at any moment could lead to the Third world war - war of planetary scale.

УДК 94 (476+470) : 338.439 «1917»

*Рыжанкоў І.М.*

## МЕСЦА І РОЛЯ ХАРЧОВАГА ПЫТАННЯ НА ПАЧАТКОВЫМ ЭТАПЕ РАЗГОРТВАННЯ ЛЮТАЎСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

*Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт, г. Мінск*

У айчыннай гістарыяграфіі савецкага перыяду, у вызначэнні прычын разгортвання Лютаўскай рэвалюцыі перавага надавалася класаваму процістаянню, стратам краіны ад Першай сусветнай вайны, палітычнаму крызісу і г.д. Гэтак жа ў дачыненні да Часовага ўрада, мерапрыемствам якога даваліся выключна негатыўныя ацэнкі. Атрыманне нашай дзяржавай незалежнасці не абумовіла карэннага пераасэнсавання названай праблематыцы. У той самы час, сапраўды наватарскімі падаюцца падыходы і высновы адбітыя ў працах Сяменчыка М. Я, Рудовіча С. С. і інш.

Важным накірункам для сучаснай гістарыяграфіі 1917 г. выяўляецца роля харчовай праблемы ў паражэнні «царскай Расіі», а таксама месца ў мерапрыемствах новастворанага ўрада. Як выбягае з перыядычных крыніц, архіўных матэрыялаў харчовае пытанне з’яўлялася адной з цэнтральных у першых адозвах ваеннай адміністрацыі, цывільных структур.

Думскія лідэры ўсведамлялі небяспеку ўзброеных, па прыкладу Петраграда выступленняў ва ўсёй краіне, таму асноўныя іх намаганні скіроўваліся на заспакаенне грамадскасці ў тым сэнсе, што «хваляванні ўзнікшых харчовай глебе беспарадкаў» адбыліся «па віне старой улады, якая згубіла Расію», а з узнікненнем новай – у асобе Часовага камітэта Дзяржаўнай думы – увайшлі ў падкантрольнае ёй рэчышча. У прэсе, публічных выступленнях палітычных дзеячаў, іх тэлеграмах і адозвах на адрас мясцовай грамадскасці ўвага акцэнтавалася на неабходнасці ўсеагульнага яднання для пераадолення цяжкасцяў, створаных царызмам.

Так, ужо ў зваротах азначанага камітэта і Савета рабочых дэпутатаў Петраграда ад 1 сакавіка, з якім, акрамя іншых, маглі пазнаёміцца жыхары буйнейшых гарадоў Беларусі, менавіта вырашэнне харчовага пытання падавалася як самая наспелая задача. «Грамадзяне Расіі! Земляробы і землеўладальнікі, гандлёвыя служачыя, чыгуначныя рабочыя! – гаварылася ў газетнай адозве. – Дапамажыце Радзіме! Трэба карміць армію і насельніцтва. Бо вораг яшчэ не зломлены. Усе, як адзін чалавек, працягніце руку дапамогі ў гэтыя вялікія грозныя дні. Няхай ніхто не ўхіліцца ад выканання свайго грамадзянскага абавязку. Няхай сумленне кожнага падкажа яго справу. Хутчэй прадавайце хлеб упаўнаважаным, аддайце ўсё, што можаце, вязіце яго па чыгунках, прыстанях, хутчэй грузіце і дастаўляйце грузы па прызначэнні. Радзіма чакае вашай агульнай дапамогі. Дайце хлеб яе змагарам і рабочым. Час не чакае. Кожная гадзіна дарагая, не марудзьце. Грамадзяне, прыдзіце на дапамогу Радзіме хлебам і працай» [1].

Таго ж, 1 сакавіка на адрас губернскіх харчовых управ імперыі разышлося распараджэнне Часовага камітэта аб рэквізіцыі хлебных запасаў ва

ўладальнікаў, якія маюць не менш 50 дзесяцін ворыва. Яго з'яўленне, акрамя іншага, мусіла азначаць курс на пэўнае абмежаванне гаспадарчай аўтаноміі памешчыцкага класу і інтэнсіўнае выкарыстанне яго прадукцыі ў інтарэсах дзяржавы.
Са з'яўленнем у друку Маніфестаў цара аб прызначэнні новага кабінета міністраў і аб сваім адрачэнні ад трона ў грамадскасці мусіла стварыцца ўражанне, што прадпрыняты ўсе захады, для паляпшэння харчовага забеспячэння і ліквідацыі пагрозы выкарыстання Германіяй азначаных «хваляванняў» у ваенных мэтах. У гэтым жа накірунку, з мэтай нагляду за парадкам і харчовым становішчам распачалі сваю дзейнасць грамадскія камітэты і ствараемыя органы ўлады Часовага ўрада.
У гэты час, усе грамадска-палітычныя, прафесійныя, нацыянальныя і іншыя арганізацыі, якія ўзніклі на Беларусі ў выніку рэвалюцыі, віталі новы лад у асобе Часовага ўрада і яго мясцовыя органы, а таксама правялі значную работу па рэарганізацыі і далейшым развіцці харчовай справы. У першыя сакавіцкія дні паводзіны непасрэдных вытворцаў сельгаспрадуктаў – сялян – знаходзілася пад асобай увагай азначаных арганізацый.
Шляхам шырокага тлумачэння вяскоўцам сэнсу падзей, што адбыліся ў краіне, зноў створаныя органы ўлады і «рэвалюцыйнай дэмакратыі» імкнуліся прадухіліць іх стыхійны рух, скіраваны на захоп памешчыцкай маёмасці. Пры гэтым, ранейшыя сродкі маральнага ўздзеяння на сялян давялося тэрмінова прыстасоўваць да новых рэалій. У гэтай сувязі сялянам прапаноўвалася падтрымаць «імкненне [урада] давесці вайну да пераможнага канца і перабудаваць радзіму на новых пачатках, якія выпрацуе Устаноўчы сход» [2].
Значнасць узброеных сіл, якія ў новых умовах набылі статус «народнай арміі», у вачах сялянства мусіла яшчэ больш узмацніцца, і, адпаведна, атрымаць дадатковыя ахвяраванні з боку вёскі. У тым жа накірунку дзейнічалі арганізатары валасных сходаў, якія дамагаліся вынясення адпаведных пастаноў і, што яшчэ больш важна, збору сялянамі ахвяраванняў для арміі. Часовы ўрад усведамляў немагчымасць выкарыстання ранейшай сістэмы нарыхтоўкі прадуктаў, заснаванай у сваёй пераважаўшай большасці на сялянскіх рэквізіцыях, і не толькі па прычыне яе слабай пасля многіх гадоў вайны прадукцыйнасці.
Са звяржэннем самадзяржаўя кабінет Г. Я. Львова мусіў пераконваць грамадскасць у адпаведнасці сваёй палітыкі інтарэсам шырокіх народных пластоў. Таму, у прыватнасці, спрыяла ўрадавая Дэкларацыя ад 4 сакавіка, якая, акрамя іншага, мусіла сведчыць аб перспектывах шырокамаштабнай дэмакратызацыі грамадскага жыцця, у тым ліку, скіраванай супраць сацыяльнай несправядлівасці. З усведамленнем таго, што ўраўнанне ўсіх жыхароў імперыі ў свабодах і правах абумоўлівала іх роўную адказнасць перад грамадствам і дзяржавай, адбылося абвяшчэнне ў друку аб рэквізіцыі хлеба ў землеўласнікаў і арандатараў, якія мелі не менш 50 дзес. ворыва.
Азначаная акцыя з'яўлялася першым крокам у напрамку эканамічных рэформ як часткі агульнай мадэрнізацыі расійскага грамадства. Нягледзячы на складанасці ўжо чыста тэхнічнага кшталту, калі старыя нарыхтоўчыя службы даўно дыскрэдытавалі сябе і не маглі ажыццявіць абвешчанага ўрадам мерапрыемства, пастанова Часовага ўрада аб рэквізіцыі прадуктаў у сярэдніх і буйных вытворцаў выклікала маральную падтрымку грамадскасці і актывізавала яе актыўнасць на месцах, што, у прыватнасці, адбілася ў асобе новых харчовых камітэтаў.
У ліку першых яны былі ўтвораны на Віцебшчыне. Так, 7 сакавіка Веліжскі павятовы камісар тэлеграфаваў Віцебскаму губернскаму камісару аб тым, што «ў Веліжы арганізаваны харчовы камітэт, члены раз'ехаліся па павеце набываць збожжа, арганізоўваецца міліцыя, парадак не парушаны» [3]. Можна

меркаваць, што іх існаванне было непрацяглям па прычыне з'яўлення адмысловага палажэння аб дэмакратычна абіраемых харчовых камітэтах.

У шэрагу ўрадавых захадаў, скіраваных на дэмакратызацыю грамадскага ладу, змякчэнне сацыяльных супярэчнасцяў, пазбаўленне эканамічных цяжкасцяў і інш., асобае месца знайшла «Пастанова Часовага ўрада аб перадачы хлеба ў распараджэнне дзяржавы» ад 25 сакавіка, у якой абвешчалася аб увядзенні дзяржаўнай манаполіі на хлебныя запасы і ўраджай 1917 года.

Пад хлебам меліся на ўвазе жыта, пшаніца, ячмень, авёс і некаторыя іншыя прадукты. Відавочна, што яе ажыццяўленне адпавядала інтарэсам арміі і асноўнай масы насельніцтва, і знаходзіла падтрымку ўсіх ўплывовых партый і арганізацый. З моманту выхаду пастановы ўсе прыватныя здзелкі з хлебам абмяжоўваліся яго здачай па «цвёрдых цэнах» дзяржаўным нарыхтоўчым службам на чале з харчовымі камітэтамі, меўшым быць абранымі дэмакратычным шляхам. У іх кампетэнцыю ўваходзіла сумесная з цывільнымі органамі ўлады і самакіравання праца па назіранні за «харчова-эканамічным жыццём» на пэўнай тэрыторыі: улік сельскагаспадарчай прадукцыі, усталяванне норм спажывання і тэрмінаў збору ўраджаю, размеркаванне пайкоў, барацьба са скупшчыкамі і інш. Ва ўмовах дэмакратызацыі грамадскага жыцця ўсенародная падтрымка Часовага ўрада, напачатковым этапе Лютага, спрыяла яго імкненням вырашыць харчовую праблему ў маштабе ўсёй краіны ў бягучы момант і ў будучыні.

**Літаратура:**

**1. Воззвание // Русское слово.— 1917.— 3 марта.— С. 2.**
**2. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. — Фонд 1778. Канцылярыя міністра-старшыні Часовага ўрада. — Воп. 1. — Спр. 143. — Арк. 50.**
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. — Фонд 60. Інстытут гісторыі партыі і сацыялістычнай рэвалюцыі пры ЦК КПБ. — Воп. 3. — Спр. 242. — Арк. 32.

*Ryzhankou I. M.*

**PLACE AND ROLE OF A FOOD QUESTION IN AN INITIAL STAGE OF EXPANSION OF FEBRUARY REVOLUTION**

*Belarusian State Technological University, Minsk*

**Summary**
In article the place of a food question in the first days of February revolution is shown. Covering a problem the author pays attention that in the appeals and actions such header themes of February as the victorious end of war, building of a republican system, agrarian reform carrying out on a straight line connected Provisional government with the successful decision of a food question.

УДК 338.48 (476)

*Семкова Т.Н.*

**ТУРИСТСКО-РЕКРЕАЦИОННЫЙ ПОТЕНЦИАЛ АРХИТЕКТУРНЫХ ПОСТРОЕК ЗАПАДНОЙ ЧАСТИ БРЕСТСКОЙ ОБЛАСТИ**

*Брестский государственный университет им. А. С. Пушкина, Брест*